**КАШТАЛА́ПАЎ** Анатоль Міхайлавіч (н. 20.7.1948, г. Магілёў), танцоўшчык і музыкант. Заслужаны артыст Беларусі (1983). З 1970 артыст балета Дзяржаўнага нар. хору Беларусі, з 1974 фалькл.-харэаграфічнага ансамбля «Харошкі», з 1988 у Бел. ансамблі нар. музыкі «Свята», з 2001 яго мастацкі кіраўнік. Разнапланавы характарны танцоўшчык і музыкант. Тэмпераментна і маляўніча выконвае розныя сола ў пастаноўках калектыву, у т.л. сола на акарыне ў нар. песнях «Калі каліна не цвіла», «Пасею гурочкі», «Песні-баладзе» ў апрацоўках В.Купрыяненкі і інш. На аснове сабранага і апрацаванага ім нар. музычнага фальклору з розных рэгіёнаў Беларусі стварыў кампазіцыі: музычна-харэаграфічную «Музыканты гуляюць» (на аснове 13 старажытных бел. мелодый) і песенна-музычную «Застольная», імправізацыйны танец «Дзяцел» на аснове нар. чачоткі, гармонікавыя найгрышы «Страданні», апрацоўкі нар. песень «Чысты чацвер», «На свята запрашаем», «Горка-горка» і інш.

*Н. Г. Мазурына.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ